# ФЕМІНІСЦКАЯ СТРАТЭГІЯ РЭВІЗІІ Ў ЭСЭ ЭДРЫЕН РЫЧ «КАЛІ МЫ, ПАМЕРЛЫЯ, ПРАЧЫНАЕМСЯ: ПІСЬМЕННІЦТВА ЯК РЭВІЗІЯ»

**Я. Ю. Субат**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*uugini@gmail.com*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дацэнт*

У артыкуле разгледжана тэарэтычнае абгрунтаванне феміністкай стратэгіі рэвізіі ў эсэ «Калі мы, памерлыя, прачынаемся: пісьменніцтва як рэвізія» («When We Dead Awaken: Writing as Re-vision», 1971) амерыканскай паэткі і выбітнай феміністкі Эдрыен Рыч, якое з'явілася адным з вызначальных тэкстаў для рэвізіяністкай плыні ў межах феміністкай літаратурнай крытыкі.

***Ключавыя словы:*** рэвізія; рэвізіяністкая плынь; феміністкая крытыка.

Адной з дамінантных тэндэнцый феміністкай крытыкі ў межах другой хвалі фемінізму з'явілася так званая рэвізіяністкая плынь, скіраваная на аналіз, асэнсаванне і перагляд існуючага літаратурнага канона, які разумеўся прадстаўніцамі плыні як з'ява апрыёры мізагінная, пабудаваная на рэпрэсіўных у дачыненні да жанчыны механізмах. Як адзначае адна з найбольш выбітных прадстаўніц рэвізіяністкай крытыкі Сандра М. Гілберт, плынь «імкнецца расшыфраваць і праясніць усе дагэтуль схаваныя пытанні і адказы, якія заўсёды затуманьвалі сувязі паміж тэкстуальнасцю і сексуальнасцю, літаратурным жанрам і гендарам, псіхасексуальнай ідэнтычнасцю і культурнымі аўтарытэтамі» [1, p. 36] (Пераклад з англійскай тут і далей мой – *Я. С.*).

Цэнтральнае месца ў рэвізіяністкай крытыцы займае стратэгія рэвізіі – працэс перагляду літаратуры мінулага праз прызму жаночага і феміністкага досведу. Менавіта гэтай стратэгіі прысвечана праграмнае эсэ амерыканскай паэткі, феміністкі і даследчыцы Эдрыен Рыч «Калі мы, памерлыя, прачынаемся: пісьменніцтва як рэвізія» («When We Dead Awaken: Writing as Re-vision», 1971). Аўтарка адзначае калектыўнае жаночае «абуджэнне свядомасці», відавочнае ў тагачасным заходнім грамадстве – нагадаем, што эсэ напісана акурат у той час, калі ствараліся найбольш выбітныя крытычныя тэксты другой хвалі фемінізму: «Жыццё падчас прабуджэння свядомасці можа хваляваць; яно можа таксама бянтэжыць, дэзарыентаваць, прычыняць боль. Абуджэнне памерлай альбо спячай свядомасці ўжо закранула жыцці мільёнаў жанчын, нават тых, хто адмаўляе яго патрабаванні» [2, p. 167]. Э. Рыч падкрэслівае агульны, калектыўны характар жаночага абуджэння, якое, на думку паэткі, павінна стаць аб'яднальным фактарам для самых розных жанчын:

«Самнамбулы прачынаюцца, і ўпершыню такое абуджэнне мае калектыўную рэальнасць; расплюшчваць вочы – ужо не такая адзінокая справа» [2, p. 167].

У эсэ «Калі мы, памерлыя, прачынаемся», як ужо было адзначана вышэй, тэарэтычна абгрунтоўваецца выкарыстанне феміністкай стратэгіі рэвізіі (альбо рэ-візіі, «re-vision») – літаральна, перагляду: «Рэвізія – акт азірання назад, бачання свежым поглядам, уваходжання ў стары тэкст у крытычным кірунку – гэта для жанчыны больш, чым глава ў гісторыі культуры: гэта акт выжывання. <…> Нам варта ведаць пісьменніцтва мінулага, разумець яго інакш, чым разумелі раней; каб не працягваць традыцыю, а разбураць яе ўладу над намі» [2, p. 168]. Прадметам рэвізіі становіцца, галоўным чынам, літаратурны канон, складзены паводле дамінуючага (то-бок, мужчынскага) пункту гледжання, а таксама механізмы рэпрэсавання жанчыны ў ім. Жанчына паўстае ў літаратуры ў трох ролях – як чытачка, як гераіня твораў і як пісьменніца; кожная з іх адчувае на сабе ўплыў андрацэнтрычнасці канона па-рознаму. Э. Рыч адлюстроўвае гэты ўплыў як на прыкладзе ўласнага досведу, так і ўзгадваючы досвед іншых жанчын: пісьменніц Эмілі Дыкінсан, Вірджыніі Вулф, Сільвіі Плат і г.д., персанажаў Джульеты, Лінор, Саламеі і інш. Аналізуючы вобразы апошніх, Эдрыен Рыч вызначае некалькі агульных функцый, выкананне якіх прызначалася жанчыне ў створаных мужчынамі тэкстах: заўсёды быць прыгожай, баяцца згубіць прыгажосць і маладосць, ці, наадварот памерці маладой, быць своеасаблівым «прадметам раскошы» для мужчыны. Сапраўдныя, «жывыя» жанчыны не атрымліваюць звычайна рэпрэзентацыі ў тэкстах, якія складаюць андрацэнтрычны канон. Жанчына (асабліва тая, якая сама мае жаданне пісаць) не знаходзіць у творах мінулага нічога, акрамя вобразаў-клішэ: «Яна знаходзіць страх і мару, знаходзіць прыгожы бледны твар, знаходзіць La Belle Dame Sans Merci, знаходзіць Джульету, ці Тэс, ці Саламею, але каго дакладна не знаходзіць – гэта захопленую, працавітую, збянтэжаную, часам натхнёную істоту, сябе, што сядзіць за пісьмовым сталом і спрабуе скласці словы ў тэкст» [2, p. 171].

Варта адзначыць, што ў разуменні Эдрыен Рыч стратэгію рэвізіі можна выкарыстоўваць не толькі ў дачыненні да кананічных тэкстаў, створаных мужчынамі: узгадваючы пісьменніц мінулага, Э. Рыч, сярод іншага, піша пра асаблівы тон пісьма, які паэтка заўважае, напрыклад, у праграмным для феміністкіх літаратурных штудый эсэ-апавяданні Вірджыніі Вулф «Свой пакой» («A Room of One’s Own», 1929). Гэта тон стрыманай злосці – пачуцця, якое Э. Рыч лічыць надзвычай важным для жаночага пісьма, бо яно, у адрозненні ад шматлікіх жаночых пачуццяў, адлюстраваных у існуючым каноне, з’яўляецца сапраўды шчырым.

Атрымліваецца, лічыць аўтарка, што нават тыя пісьменніцы, якія трымаюцца ў сваёй творчасці крытычнага (у той ці іншай ступені) да патрыярхальнай сістэмы кірунку, не пазбаўлены ўплыву гэтай сістэмы – гэта датычыцца ў тым ліку і мовы, якую такія пісьменніцы абіраюць, ці прымушаны абіраць. Злосць паўстае заканамерным пачуццём для жанчыны, з якой ужо адбылося «абуджэнне», якая нарэшце пабачыла патрыярхальную рэчаіснасць як яна ёсць – злосць, такім чынам, з'яўляецца і чарговым этапам вызвалення з гэтай сістэмы: «Я лічу, што нам трэба прайсці праз гэтую злосць, і мы здрадзім сваёй рэальнасці, калі паспрабуем, як Вірджынія Вулф, быць аб'ектыўнымі, бесстароннымі, каб гучаць падобна да Джэйн Остын ці Шэкспіра. <…> І віктымнасць, і злосць, якую адчуваюць жанчыны – рэальныя і маюць рэальныя крыніцы паўсюль, яны ўбудаваныя ў грамадства. Іх павінны асвойваць і даследаваць, сярод іншых, паэткі. Мы не можам ні аспрэчыць іх, ні спыніцца на іх. Яны – гэта нашыя схваткі, мы нараджаем самі сябе. Мы здрадзім адна адной, як пісьменніцы і як жанчыны, калі будзем грэбаваць, адмаўляць усё негатыўнае, рэгрэсіўнае, ці Сізіфскіае, што ёсць у нашай сутнасці» [2, p. 176].

Злосць, якой Эдрыен Рыч надае такую важную ролю ў сваім разуменні працэсу рэвізіі, урэшце рэшт стане прычынай крытыкі рэвізіянісцкай плыні з боку больш позніх прадстаўніц жаночых штудый у літаратуры: напрыклад, Элейн Шоўолтэр, распрацоўшчыца гінакрытыкі («Toward a Feminist Poetics», 1979), адзначае, што рэвізіянісцкая плынь занадта засяроджваецца на андрацэнтрычным каноне – нават калі пераглядае і пераасэнсоўвае яго; гэта, на думку даследчыцы, не дае жанчынам магчымасці стварыць уласную мову і ўласны канон [3]. Аднак дасягненні рэвізіянісцкай плыні – у першую чаргу, канешне, сама стратэгія рэвізіі – сталі вызначальным этапам феміністскай літаратурнай крытыкі і выдатным падмуркам для наступных штудый.

### 1. Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Gilbert, S. M.* What Do Feminist Critics Want / S. M. Gilbert // The New Feminist Criticism. Essays on Women, Literature, and Theory / edited by Elaine Showalter – New York: Pantheon Books, 1985. – 403 pp.

*Rich, A. C.* Adrienne Rich's poetry and prose: poems, prose, reviews, and criticism / selected and edited by Barbara Charlesworth Gelpi, Albert Gelpi / A. C. Rich. – W. W. Norton & Co, Inc. / New York, 1993. – 433 pp.

*Showalter, E.* Feminist Criticism in the Wilderness / E. Showalter// The New Feminist Criticism. Essays on Women, Literature, and Theory / edited by Elaine Showalter – New York: Pantheon Books, 1985. – 403 pp.